# Жыве ў Заброддзі памяць

## Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны

Першая сусветная вайна не саступае Другой па свайму трагізму, жудаснасці, незлічоным бедствам. Вынікі гэтых падзей патрабуюць асэнсавання і памяці, заклікаюць людзей не дапускаць паўтарэння жахаў ваеннага ліхалецця.

**Міхаіл КУЧКО**



**А Ў Т А Р**
МІХАІЛ МІКАЛАЕВІЧ КУЧКО, НАСТАЎНІК ГІСТОРЫІ І ГРАМАДАЗНАЎСТВА ДУА «НАРАЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА ВІЛЕЙСКАГА РАЁНА». СКОНЧЫЎ ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БДУ. ЗАЙМАЕЦЦА КРАЯЗНАЎСТВАМ, ДАСЛЕДУЕ ГІСТОРЫЮ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЛЕЙСКАГА РАЁНА. КІРАЎНІК ШКОЛЬНАГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ «СПАДЧЫНА». УЗНАГАРОДЖАНЫ ГРАМАТАМІ АБЛАСНОГА ЎПРАЎЛЕННЯ АДУКАЦЫІ, РАЁННАГА АДДЗЕЛА АДУКАЦЫІ. ПЕДАГАГІЧНЫ СТАЖ — БОЛЬШ 30 ГАДОЎ.

Вілейшчына цесна звязана з падзеямі Першай сусветнай вайны. У 1916 годзе тут праходзіла лінія фронту, адбываліся Нарачанская і Вілейская наступальныя аперацыі, на працягу 862 дзён ішлі баі за Смаргонь. Да цяперашняга часу ў лясах Вілейшчыны можна бачыць сляды тых падзей: траншэі, акопы, рвы і магілкі. Ахвяр было шмат, і мноства магільнікаў і адзіночных ваенных пахаванняў знаходзяцца на тэрыторыі Вілейскага раёна. Пахаванні салдат рускай арміі ёсць каля вёсак Порса, Заброддзе, Родзевічы, Папоўцы, Лыцавічы. Каля вёскі Муляры засталіся магілкі германскіх салдат.

Трагедыя Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны была не толькі ў разбуральным характары баявых дзеянняў на яе тэрыторыі, але яшчэ і ў цяжкім становішчы, у якім апынулася ў чарговы раз мірнае грамадзянскае насельніцтва нашай краіны.

Як адрадзіць гэту памяць пра былое і захаваць яе для будучыні? Зрабіць гэта можна толькі з дапамогай апантаных, ініцыятыўных людзей. Яны ёсць у Беларусі і на Вілейшчыне. Сярод гэтых людзей трэба асобна вызначыць Барыса Барысавіча Цітовіча. Мастак па прафесіі, аўтар і распрацоўшчык, натхняльнік і выканаўца самых знакавых краязнаўчых праектаў, звязаных з гісторыяй Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Вілейскага раёна.

Лёсам было наканавана, каб сям'я Цітовічаў абрала для свайго сталага жыхарства ў 1974 годзе менавіта вёску Заброддзе, што ў Вілейскім раёне. Спадабаліся тут ім не толькі сама прырода, рака Нарачанка, але і самі жыхары гэтай невялікай вёскі. І не змог нават уявіць тады Барыс Барысавіч сам, яго жонка Валянціна Пятроўна, што гэтыя мясціны вызначаюцца не толькі сваёй прыгажосцю, але і гісторыяй.

Спачатку Цітовічы стварылі дзіцячы лялечны тэатр «Ялінка» пры Нарачанскім сельскім доме культуры. Тэатр хутка стаў вядомым у раёне, вобласці і ва ўсёй рэспубліцы. А напачатку 1980-х гадоў адбылася падзея, якая карэнным чынам змяніла жыццё Барыса Барысавіча. Праводзіліся летнія вучэнні воінскай часці Савецкай Арміі, і салдат размясцілі ў ляску паблізу вёскі Заброддзе. Патрэбна было выкапаць зямлянкі, ямы для сховішчаў, акопы. Салдаты заўважылі, што разам з пяском сталі паяўляцца чалавечыя астанкі, рэшткі зброі, іншыя рэчы, якія належылі толькі ваенным людзям.

Камандзір часці, палкоўнік Уладзімір Лігута, цяпер вядомы краязнаўца Гродзеншчыны, аўтар кнігі «Боль і кроў пад Смаргонню» аддаў за-



*Помнік на месцы баёў рускіх салдат*

гад спыніць работы і сустрэўся з Цітовічам у Заброддзі. Яны разам пачалі даведвацца ў мясцовых жыхароў, што гэта за могільнік у ляску. Тады ў жывых былі непасрэдныя сведкі падзей 1916-1917 гадоў паблізу вёскі Заброддзе. Мясцовыя і расказалі, што ў 1916 годзе ў гэтым ляску знаходзіўся паходны лазарэт рускіх войск, і памерлых ад ран салдат і афіцэраў хавалі на тым жа месцы. У аднаго з жыхароў знайшлася і фатаграфія 1916 года з салдатамі, санітаркамі і дакторкай гэтага лазарэта.

Фёдар Іванавіч Шупляк таксама расказаў шмат цікавага. Сам ён прымаў актыўны ўдзел у гэтай вайне, быў узнагароджаны Георгіеўскім крыжам і залічаны ў ахову імператара Мікалая ІІ пры Стаўцы ў Магілёве. Адзначаны Фёдар Іванавіч Шупляк быў не толькі баявымі ўзнагародамі, але і апаратам для фатаграфавання.

Барыс Цітовіч зразумеў, што гэта толькі пачатак, і прапанаваў ідэю стварэння ў Заброддзі ваенна-гістарычнага, патрыятычнага цэнтра. Яго падтрымалі ўлады, актыўна падключыліся да гэтай справы і вучні Нарацкай сярэдняй школы.

Першым крокам у стварэнні такога цэнтра стала адкрыццё палісада Перамогі 9 мая 1984 года. Ва ўрачыстай абстаноўцы быў устаноўлены камень з высечаным на ім надпісам і пасаджаны першыя дрэўцы.

Веліч разумення сувязі пакаленняў, падзей і асэнсаванне асабістай прыналежнасці да спадчыны народа — вось, што ўсвядомілі тагачасныя школьнікі, калі на іх вачах першыя дрэўцы ў палісадзе Перамогі пасадзілі народны пісьменнік БССР Васіль Быкаў і Георгіеўскі кавалер Фёдар Іванавіч Шупляк. Менавіта з 1984 года пачынаюць адлік традыцыйныя святкаванні Дня Перамогі ў вёсцы Заброддзе з запрашэннем вядомых людзей краіны, замежных гасцей з Еўропы.

Наступныя гады былі прысвечаны збору дакументальных матэрыялаў, архіўных звестак. Працягвалася пошукава-даследчая работа, у якой удзельнічалі і навучэнцы Нарацкай сярэдняй школы, запісваліся ўспаміны жыхароў Заброддзя і навакольных вёсак. Вучні нашай школы атрымалі магчымасць набыцця і развіцця навыкаў і ўменняў гісторыка-краязнаўчай, турысцкай, пошукава-даследчай работы.

У школе пачынае дзейнічаць краязнаўчы гурток «Юны краязнавец». Гурткоўцы збіралі дакументальны матэрыял, прадметы хатняга ўжытку жыхароў сваіх вёсак, знаходзілі ваенныя рэчы, якія потым і сталі экспанатамі школьнага краязнаўчага музея, адкрытага ў снежні 1995 года.

Цяпер школьны краязнаўчы музей «Спадчына» налічвае больш за 500 экспанатаў толькі асноўнага фонду, якія расказваюць пра гісторыю сваёй і навакольных вёсак. Музей пастаянна папаўняецца экспанатамі, і гэтаму дапамагаюць удзельнікі аб'яднання па інтарэсах для навучэнцаў 5-11 класаў «Юны краязнавец». Тут займаюцца ўжо дзеці тых, хто пачынаў сваю гісторыка-краязнаўчую дзейнасць у другой палове 80-х гадоў XX стагоддзя.

У той час пра Першую сусветную вайну было вельмі мала матэрыялу, нават у падручніках па гісторыі. Дзякуючы ініцыятыве Барыса Цітовіча, супрацоўнікам Вілейскага краязнаўчага музея, уладам і бескарыслівай дапамозе прыватных асоб



*Перазахаванне астанкаў байцоў з воінскімі ўшанаваннямі*



*Месца лазарэта і могільнік пахаваных салдат і афіцэраў 2-ой Рускай арміі*

і пры пастаянным удзеле у гэтай справе вучняў нашай школы цяжкая і крапатлівая, сумесная работа прынесла свой плён.

У пачатку 2000 года была прапанавана ідэя стварэння ў Заброддзі музея гісторыі Першай сусветнай вайны. Мясціна стала ўжо дастаткова вядомай. Вёску не абміналі шматлікія турысты, яна была ўнесена ў турысцка-краязнаўчы маршрут знакамітых мясцін раёна. Праект музея быў распрацаваны Барысам Цітовічам пры ўдзеле архітэктара з Вілейкі Анатоля Капцюга. Такая праца была ацэнена: Барыс Цітовіч становіцца лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

Музей па задумцы аўтараў праекта ахопіць мясціны, дзе праходзіла лінія фронту ў 1915-1917 гадах па тэрыторыі сучаснага Вілейскага раёна. Асноўным цэнтрам музейнага агляду павінна стаць вёска Заброддзе.

На цяперашні час ужо пастаўлена 16 помнікаў, абеліскаў, каплічак на месцах баёў і пахаванняў расійскіх салдат. Першай стала каплічка ў вёсцы Жарствянка, пастаўленая ў 2000 годзе. Затым да справы былі падключаны салдаты 52 пошукавага батальёна Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусі, якія правялі дадатковыя раскопкі на месцы знаходжання лазарэта. 27 кастрычніка 2003 года адбылося перазахаванне астанкаў знойдзеных воінаў з усімі воінскімі ўшанаваннямі. На месцы перазахавання пастаўлены пяцімятровы крыж з выявай Спаса Нерукатворнага вагай у 3 тоны па шашы Вілейка — Смаргонь.

У экспазіцыю будучага музея ўваходзіць часоўня князёў Барыса і Глеба; памятны знак казаку-разведчыку Даніле Шаўчэнку, забітаму нямецкім снайперам (Праз 80 гадоў нашчадкі Д. Шаўчэнкі ў Расіі, якія пражываюць цяпер у Курскай вобласці, атрымалі звесткі, дзе, як і калі загінуў іх прадзедю.); месца дыслакацыі лазарэта і могільнік пахаваных салдат і афіцэраў 2-ой Рускай арміі, 28-й і 29-й дывізій.

Для ажыццяўлення праекта стварэння дзяржаўнага музея быў заснаваны дабрачынны фонд «Крокі. Музей Першай сусветнай вайны». Кіраўніком фонду з'яўляецца вядомы тэлежурналіст, ваенны гісторык Вячаслаў Бандарэнка.

Без мінулага няма будучыні. Памяць, якая жыве ў Заброддзі, гэта адна з маленькіх сцяжынак вялікага шляху да моцнай і квітнеючай Беларусі. М



*Часоўня князёў Барыса і Глеба*